**Наименование ТВП:** Пойма Щары






© С. Левый

**Код:** BY055

**Географические координаты:** 52°46.57' N 25°47.56

**Административная принадлежность:** Брестская область: Ивацевичский район, Ляховичский район

**Площадь:** 2594 га

**Критерии:** A1

**Национальный природоохранный статус:** Паўднёвая частка Ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Выганашчанскае»

**Международный природоохранный статус:** ТВП міжнароднай значнасці

## Общее описание:

ТВП "Пойма Шчары" утворана ў 2012 г. Знаходзіцца ў 3 км на поўнач ад воз. Выганашчанскае. Паўднёвая частка ТВП уваходзіць у склад ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння “Выганашчанскае”.

Тэрыторыя ТВП уключае поплавы р. Шчара, а таксама меліарыраванныя угодзі, якія слаба выкарыстоўваюцца. Рака Шчара не каналізавана, захавалася ў натуральным стане. У межах ТВП працягласць ракі больш за 20 км. Рэчышча звілістае, шырынёй да 20 м. Берагі нізкія, пераважна тарфяністыя. Праз Агінскі

канал злучаецца з воз. Выганашчанскае. Акрамя таго, Агінскі канал праз Шчару і Ясельду злучае басейны Балтыцкага і Чорнага мораў.

Менавіта поймавыя адчыненыя лугі Шчары, захаваўшыяся ў натуральным стане, з'яўляюцца найбольш каштоўнымі біятопамі гэтай ТВП, як месца гнездавання глабальна пагражаемага віду вяртлявай чаротаукі *Acrocephalus paludicola* і месца харчавання яшчэ аднаго глабальна пагражаемага віду - вялікага арляца *Aquila clanga*. Вяртлявая чаротаўка таксама адзначана ў значнай колькасці і на меліярыраванных участках, парослых асокамі.

У межах ТВП адсутнічаюць населеныя пункты, дарожная сетка не развіта. Тэррыторыя выкарыстоўваецца галоўным чынам для сенакашэння на меліярыраванных землях, палявання, рыбнай лоўлі, радзей для турызма.

## Основные биотопы:

Натуральная рачная пойма з адчыненымі поплавамі і трысняговымі зараснікамі - 70%, сельгасугоддзі на меліярыраваных землях - 25%, іншае - 5%.

## Птицы:

Склад птушак ТВП "Пойма Шчары" даследаван недастаткова. Аснову арнітафауны складаюць птушкі паплавоў, вадаплаваючыя і каляводныя віды. Падчас веснавой міграцыі на разлівах Шчары адзначаецца значная колькасць розных відаў качак, крычак і кулікоў. У тым ліку качка-лапаноска *Anas clypeata*, баталён *Philomachus pugnax*, кулік-случок *Tringa totanus*, чорная крычка *Chlidonias niger*, белакрылая крычка *Chlidonias leucopterus*, белашчокая крычка *Chlidonias hybrida* і інш.

## Другие группы животных:

не даследавана.

## Состояние редких видов птиц:

| Виды | Статус | Количество | Год/период оценки | Точность оценки | Тренды (2000-2011) | Критерий ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Выпь большая *Botaurus stellaris* | гн | 2 с | 2010-2013 | Т | ↔ | |

| Виды | Статус | Количество | Год/период оценки | Точность оценки | Тренды (2000-2011) | Критерий ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Подорлик большой *Aquila clanga* | зал | 2 ос | 2010-2013 | П | ↔ | |
| Турухтан *Philomachus pugnax* | мг | 200-400 ос | 2013 | П | | |
| Камышовка вертлявая *Acrocephalus paludicola* | гн | 36-40 с | 2010 | Т | ↔ | A1 |

## Другие редкие и находящиеся под угрозой исчезновения виды:

не даследавана.

## Угрозы:

1. **Зарастенне меліярыраванных земляў і поплаваў хмызнякамі.** На шматлікіх участках ТВП (як на меліярыраванных, так і натуральных) адзначаеца павелічэнне плошчы хмызнякоў. Гэты вядзе да знікнення месц гнездавання вяртлявай чаротаукі *Acrocephalus paludicola* і месц харчавання вялікага арляца *Aquila clanga*.
2. **Сенакашэнне у гнездавы перыяд.** Пры нізкімузроўне вады на меліярыраванных угоддзях праводзіцца сенакашэнне тэхнікай ў час калі яшчэ гняздзяцца многія віды птушак (у тым ліку і вяртлявая чаротаўка). Гэтая вядзе да гібелі птушанят і кладак.
3. **Нестабільнасць узроўню вады.**

## Рекомендации по сохранению:

неабходна стварэнне плана кіравання ТВП.

## Источники информации:

Блакітная кніга Беларусі (Водныя аб'екты Беларусі). Энцыклапедыя. Мінск, 1994.

**Составители :** Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*